# ЗМЕСТ

*Ганна Кісліцына.* Класік беларускага авангарда . . . . . . . . . . . 5

**ВЕРШЫ** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 21

Мова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 23

«Наіўны хлопчык з сіняй казкі...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 24

Спякота . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 25

Адкрыццё . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 26

«Які запал!..» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28

Немагчымае . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 30

«Ноч гасіць у вокнах агні...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32

Чалавек . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33

Шчасце . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 34

Празорца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 34

Воля . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 35

«Урал, Урал!..» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36

«Сцюдзёнае паветра разлілося...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37

Паганіні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 38

Сакавік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40

Нявыказаная балада . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 41

Дрэвы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 42

Лес . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 44

Запавет . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 46

«Сачу вясну...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 47

«Іх далячыні развялі...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 48

Радзіма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49

«Не распнутае доляю ўбогай...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 50

«Адно сказаць...» . . . . . . 52
«Каб не пакінуць успаміну...» . . . . . . 54
«Усюды голас твой чуцён...» . . . . . . 55
Папярэджанне . . . . . . 56

**ПАЭМЫ** . . . . . . 59

Гліна. Камень. Жалеза (Трыпціх) . . . . . . 61
Гліна . . . . . . 61
Камень . . . . . . 94
Жалеза . . . . . . 127

**ПУНКЦІРЫ** . . . . . . 161

**ВЕРСЭТЫ** . . . . . . 305

Сінія людзі . . . . . . 307
Чорны абраз . . . . . . 308
Маланка . . . . . . 309
Мяжа . . . . . . 310
Паверхня . . . . . . 311
Трансмутацыя . . . . . . 312
У старой хаце . . . . . . 313
Танец з вужакамі . . . . . . 314
«Што прымушае нас...» . . . . . . 315
«Абуджаюся і засынаю...» . . . . . . 316
Лабараторыя . . . . . . 317
Адліга . . . . . . 318
Краты . . . . . . 320
Лужыны . . . . . . 321
Рыбіна . . . . . . 322
«Прымаю тое, што ёсць...» . . . . . . 323
Пастухі . . . . . . 324
Сяргей Цыган . . . . . . 325

Планета метамарфозаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 326
У лесе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 327
З ключом у руцэ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 328
Гліняныя чалавечкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 329
У каморы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 330
Тыгр . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 332
Газеты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 333
Пасажыры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 334
Мітынг . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 335
Тры труны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 336
Маму Тхакур дас . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 338
Хмара . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 339
Чырвоны змрок . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 340
На свята Збавення душы і цела . . . . . . . . . . . . . 341
Бацькавы рэчы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 342
Ідал . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 344
Алёсы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 345
Навіны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 346
Падводны плывец . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 347
Маленькія ночвы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 348
Сербская вёска . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 349
Палёт кажана . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 350
Навальніца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 351
Бездань . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 352
Спрадвечны пыл . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 353
Надзея, якая не мае патрэбы ў абгрунтаванні . . . . . . . . . . . 354
Старэйшы брат . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 355
Чырвоная гліна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 356
Бура . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 357
Атрад . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 358
Ян . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 360
Дымныя коміны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 361

Нехта ........ 362
Музыка ........ 363
Крывая вежа ........ 364
Гной ........ 364
Сляпы мастак ........ 365
Падарожжа Альжбеты па родным краі ........ 366
У невядомай далёкай сядзібе ........ 367
«Самая большая навіна...» ........ 368
Дубы Заходняга краю ........ 369
Ляснік Амелька ........ 370
Драпежная птушка ........ 371
Рымская дарога ........ 372
Зімовыя прыцемкі ........ 373
Шэрыя гусі ........ 374
Падзея ........ 375
Габрайскія могілкі ........ 376
Узвышша ........ 377
Пажары ........ 378
Кожны ........ 379
У царкве ........ 380
Заваёўнікі ........ 381
Рэчы ........ 390

**ВЕРШАКАЗЫ** ........ 397

Скрынка ........ 399
Пастка ........ 400
Крыга ........ 402
Студня ........ 403
Твань ........ 404
Калода ........ 405
Зброя ........ 406
Ступа ........ 407

Гутарка ........ 408
Плуг ........ 409
Вежа ........ 410
Грошы ........ 411
Барана ........ 412
Кнот ........ 413
Лес ........ 414
Грыб ........ 416
Верас ........ 417
Дуга ........ 418
Гузік ........ 419
Павуціна ........ 420
Дзіда ........ 421
Пень ........ 422
Кажух ........ 423
Лейцы ........ 424
Кудзеля ........ 425
Крэйда ........ 426
Венік ........ 427
Голад і холад ........ 428
Вір ........ 429
Стол ........ 430
Вясло ........ 431
Будзень і свята ........ 432
Трэшчына ........ 433
Сцежка ........ 434
Нара ........ 435
Кій ........ 436
Клін ........ 437
Гняздо ........ 438
Сані ........ 439
Пляма ........ 440

Купіна ........................................ 441
Вецер ........................................ 442
Жолуд ........................................ 444
Човен ........................................ 445
Лебяда ........................................ 446
Попел ........................................ 447
Ліхтар ........................................ 448
Звон ........................................ 449
Лапці ........................................ 450
Нерат ........................................ 451
Верацяно ........................................ 452
Багна ........................................ 453
Ключ і замок ........................................ 454
Свярдзёлак ........................................ 455
Аладка і блін ........................................ 456
Шкарлупіна ........................................ 457

**КВАНТЭМЫ** ........................................ 459

**ЗНОМЫ** ........................................ 487

# КЛАСІК
# БЕЛАРУСКАГА АВАНГАРДА

«З маланкаю ў сэрцы» — так павінен быў называцца том выбранага, які ўклаў сам паэт у 2019 г. Назва супадае з радком аднаго з разанаўскіх версэтаў, але значна шырэйшая за яго змест. Бо маланка — гэта і паэтычная метафара той энергіі, якая злучае ў творчасці паэта зямлю і неба, быццё і небыццё, і метафара тых выпрабаванняў, якія выпалі на яго долю. Здаецца вельмі важным, каб чытачы маглі ацаніць творчасць Алеся Разанава, кіруючыся яго ўласнымі ўяўленнямі пра тое, якія з яго твораў з'яўляюцца найбольш істотным здабыткам для айчыннай літаратуры. У гэту анталогію ўвайшло не ўсё адабранае — у тым рукапісе было каля 1200 старонак, — але асноўныя кірункі яго творчых пошукаў у кнізе, якую вы трымаеце ў руках, прадстаўлены. На наш погляд, яны даюць поўнае ўяўленне, чаму Алеся Разанава называлі класікам беларускага авангарда, бо краевугольнай ідэяй авангарда, нагадаем, з'яўляецца выйсце за межы вядомага ў невядомае і нават непазнавальнае.

Уведзеныя паэтам новыя формы, такія як квантэма, версэт, пункцір, вершаказ, зном, зрабілі нашу паэзію больш разнастайнай, паўплывалі на характар яе далейшага развіцця і сталі візітнай карткай цэлай генерацыі пісьменнікаў. Аднак рэфарматарства А. Разанава выяўляецца не толькі ў аднаўленні літаратурнай формы, у першую чаргу яно звязана з пошукамі новай змястоўнасці, стварэннем новай паэтычнай канцэпцыі свету і чалавека.

У 1970 г. пабачыла свет першая кніга А. Разанава са смелай для таго часу назвай — «Адраджэнне». Першапачатковая яе назва гучала ці не большым выклікам — «Адрачэнне». Пазней паэт патлумачыць: «Тут адбылася пэўная транскрыпцыя. Назва зборніка мела на ўвазе іншае — адрачэнне. Адрачэнне ад таго, што мне не падабалася, прымушала хадзіць па нейкіх кругах і абмяжоўвала жаданне думаць, разумець...». У зборнік не ўвайшлі некаторыя ўжо вядомыя па ранейшых публікацыях вершы, а астатнія былі бязлітасна адрэдагаваны (пра гэта ўжо тады напісаў А. Вярцінскі). Аднак кніга атрымала шырокі грамадскі рэзананс, выклікаўшы шматлікія водгукі крытыкаў, якія адзначалі не толькі змястоўную глыбіню паэзіі маладога аўтара, але і майстэрскае валоданне вершаванай тэхнікай. Вось што напісаў пра рытміка-інтанацыйную адметнасць вершаў «Адраджэння» літаратуразнаўца І. Ралько: «Нават самыя класічныя памеры (ямб, харэй) падпарадкоўваюцца ў паэта стыхіі акцэнтнага верша. Імклівы, напружана-драматычны рытм набывае індывідуальную адметнасць дзякуючы частаму вынясенню ў пачатак радка слоў, на якія падае найбольшая сэнсавая нагрузка не толькі ў асобным рытмарадзе, але і ўсім вершы. Сіла націску ў гэтых словах намнога вышэй, чым у суседніх, а калі не вышэй, то сэнсавая значнасць іх, як правіла, падкрэсліваецца рытмічнай паўзай. Цікава, што і ў пачатак радка выносяцца пераважна дзеясловы. Пры тым вельмі часта гэтыя дзеясловы выступаюць у якасці лексічнай або сінтаксічнай анафары». Нягледзячы на тое, што А. Разанаў у далейшым амаль перастаў карыстацца сілаба-танічным вершам, рытміка-інтанацыйная сістэма яго паэзіі амаль не змянілася, стаўшы прыкметай індывідуальнага стылю.

# КЛЮЧ І ЗАМОК

Ключ кліча, замок адгукаецца, ключ шукае, замок чакае, ключ ведае, замок мае, ключ то знікае, то зноўку ўзнікае, замок застаецца заўсёды на тым самым месцы.

Ключ ад усіх хаваецца, замок усім аб’яўляецца, ключ — у схованцы, замок — навідавоку, ключ уладкоўваецца ў сухім і ў цёплым, замок мокне на дажджы і калее на холадзе.

Ключ — клічнік, замок — пытальнік, ключ — модус, замок — атрыбут, ключ — учынак, замок — з’ява, ключ належыць мужчыне, замок — жанчыне, ключ — неба, замок — зямля.

Замок забараняе, ключ дазваляе, замок — зіма, ключ — вясна, замок — правіла, ключ — выключэнне, замок — загадка, ключ — адгадка, замок — нуль, ключ — адзінка.

Ключ бачыць, замок пазірае, ключ чуе, замок слухае, ключ — лічба, замок — слова, ключ — дзейнік, замок — выказнік, ключ — выпадковасць, замок — заканамернасць, ключ — магчымасць, замок — неабходнасць.

Ключ — смык, замок — скрыпка, і куды б, далёка ці блізка, ні адыходзіў ключ ад замка, сувязь, якая іх лучыць, не калечыцца і не камечыцца, і адкуль бы, здалёк ці зблізку, ні вяртаўся ключ да замка, за гэтым вяртаннем сочыць музыка іхніх узаемадачыненняў.

*

малюнкі мне
мінулае лунае
ў акне адзінкі
месяц без нуля

*

полымя моліцца
у чысціню
у прычасці
постаць чыясьці

*

з іскрыны слова
латае старое
карысць нанова
ў скрыні палатно

*

тасуюцца стасункі
наўздагон
вагон вагае
у сутыку суткі

*

адзенне недзе
год узнагарода
дзе я
дзе ты
знаходзіць карагод